БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 1 кастрычніка 1998 года, чацвер, № 13 (1786)

КОНКУРС

Лепшыя з лепшых у навуцы

Як паведамілі карэспандэнту «Беларускага універсітэта» ў навукова-даследчай частцы універсітэта, аб'яўлены конкурс на прысуджэнне навукоўцам нашай навучальнай установы прэмій імя У. І. Пічэты і А. М. Сеўчанкі. Першую з іх маюць магчымасць атрымаць лепшыя з тых, хто займаецца навуковымі распрацоўкамі ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, другую — навукоўцы, якія вядуць даследаванні па прыродазнаўчых навуках.

Разам з тым аб'яўлены конкурс на лепшыя навуковыя работы студэнтаў таксама па дзвюх намінацыях — сацыяльныя і гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі.

Разглядам прапаноў аб прысуджэнні адзначаных прэмій будзе займацца камісія на чале з рэктарам Аляксандрам Уладзіслававічам Казуліным. У склад яе ўвайшлі прарэктар па навуковай рабоце Сяргей Кімавіч Рахманаў, вучоны сакратар НДЧ Алег Мікалаевіч Янкоўскі, а таксама дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедраў, прадстаўнікі навукова-даследчых інстытутаў.

Комплекс арганізацыйных мерапрыемстваў па вылучэнню лепшых навуковых работ на конкурс павінен прайсці да 10 кастрычніка гэтага года. Прапановы па прысуджэнню прэмій, якія адобрылі Саветы факультэтаў і навуковых устаноў, павінны быць прадастаўлены вучонаму сакратару НДЧ А. М. Янкоўскаму не пазней за 17 кастрычніка 1998 года (вул. Бабруйская, 7, пакой 416). Яны павінны быць афармлены ў адпаведнасці з Палажэннем аб прэміях.

Уручэнне прэмій імя У. І. Пічэты і А. М. Сеўчанкі і прэмій за лепшую навуковую работу студэнтаў адбудзецца на пасяджэнні Савета БДУ ў гадавіну стварэння Белдзяржуніверсітэта.

Інтэрв'ю з пераможцамі чытайце ў адным з наступных нумароў «Беларускага універсітэта».

Марына АВЕРКІНА

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

ГУЛЬНЯ ПА ПРАВІЛАХ

22 верасня адбылася сустрэча прарэктара Белдзяржуніверсітэта па эканоміцы і камерцыйных пытаннях Сяргея Аляксандравіча Векшы са старшынямі Саветаў старастаў факультэтаў. Асноўнае пытанне сустрэчы — аб сістэме платнай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэце. Цяпер усім студэнтам універсітэта, якія навучаюцца на платнай аснове, прапанавана падпісаць дадаткі і змены да раней заключанага дагавора аб платнай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй. Больш за ўсё ўвагі было нададзена той яго частцы, дзе гаворыцца аб кошце ўмоўнай адзінкі, які вызначаецца універсітэтам.

Сяргей Аляксандравіч патлумачыў, што ў старых дагаворах не прадугледжаны варыянт множнасці курса долара ЗША, што зараз назіраецца ў Беларусі. Хаця ў Белдзяржуніверсітэта ёсць дазвол на прыём наяўнай валюты, практыкуецца аплата за навучанне па безнаяўнаму разліку ў беларускіх рублях і валюце. Але паколькі большасць затрат на навучанне студэнтаў-платнікаў адбываецца па безнаяўнаму разліку, у аснове якога ляжыць курс долара, вызначаны на міжбанкаўскім валютным рынку (камерцыйны курс долара), то і універсітэт вымушаны выконваць тыя правілы, па якіх рэальна функцыянуюць суб'екты гаспадарання. У іншым выпадку платная адукацыя ў Белдзяржуніверсітэце проста стане немагчымай. І тым не менш, універсітэт вызначае кошт умоўнай адзінкі як сярэдні паміж курсам Нацыянальнага банка і камерцыйным. Тым самым больш за палову ўзніклай фінансавай нагрузкі БДУ прыняў на сябе.

Органы дзяржаўнага кантролю і кіраўніцтва пастаянна аналізуюць наяўную сітуацыю і істотных парушэнняў ва універсітэце не знайшлі.

Напрыканцы сустрэчы старшыні Саветаў старастаў факультэтаў выступілі з ініцыятывай правядзення рэгулярных сустрэч з прадстаўнікамі адміністрацыі Белдзяржуніверсітэта.

А.Л. САКОЛЬНІК,
старшыня Савета
старастаў БДУ

КАНФЕРЭНЦЫІ

ЕЎРА — КРОК НАСУСТРАЧ XXI СТАГОДДЗЮ

З 27 па 29 кастрычніка гэтага года на базе нашага універсітэта Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі сумесна з «Белзнешэканамбанкам» арганізуе міжнародную канферэнцыю «Еўрапейскі валютны саюз — крок насустрач XXI стагоддзю!?» Сярод тэм, прапанаваных для абмеркавання на канферэнцыі, — эканамічны і валютны Саюз: інстытуты, механізмы, працэдуры; гісторыя стварэння эканамічнага і валютнага саюза; сацыяльна-палітычныя аспекты фармавання эканамічнага і валютнага саюза; магчымыя наступствы ўвядзення еўра для сусветнай эканомікі, краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, краін СНД і Рэспублікі Беларусь. Таксама плануецца разгледзець тэарэтычныя і практычныя аспекты ўвядзення еўра, практычныя шляхі вырашэння новых задач, выкліканых з'яўленнем адзінай еўрапейскай валюты. Адна з мэтаў канферэнцыі — знаёмства шырокай грамадскасці з працэсам увядзення еўра, яго значэнне для простых грамадзян, розных арганізацый і прадпрыемстваў, фінансавых і эканамічных інстытутаў.

Прыняць удзел у мерапрыемстве запрошаны прадстаўнікі Еўрапейскай Камісіі, вядучых еўрапейскіх банкаў, фінансавых колаў Беларусі і краін СНД, навукоўцы і даследчыкі, супрацоўнікі рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, Нацыянальнай акадэміі навук, вышэйшых навучальных устаноў.

Афіцыйныя мовы канферэнцыі: руская і англійская.

Адрас аргкамітэта: Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр-т Ф. Скарыны, 4, пакой 112. Тэл./факс: (017)-220-65-38 E-mail: yri@org.bsu.unibel.by

АБ'ЯВЫ

Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх моў, агульнай фізікі, глебазнаўства і геалогіі, матэматычнай фізікі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычных метадаў тэорыі кіравання, тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, вышэйшай алгебры, этыкі і рэлігіязнаўства;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, метадаў аптымальнага кіравання, матэматычнага забеспячэння АСК, тэорыі імавернасці і матэматычнай статыстыкі, матэматычнага забеспячэння САПР, матэматычнага мадэліравання і аналізу данных, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, тэорыі функцый, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, фізіялогіі чалавека і жывёл, глебазнаўства і геалогіі, гісторыі Расіі, філасофіі і метадалогіі навукі, псіхалогіі, эканамічных навук;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, батанікі, крыніцазнаўства і музеязнаўства, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, гісторыі філасофіі і культуры;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: педагогікі і праблем развіцця адукацыі, філасофіі і метадалогіі навукі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вылічальнай матэматыкі, матэматычнага забеспячэння САПР, агульнай матэматыкі і інфарматыкі.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, т. 226-59-39.

ФОТАФАКТ

Галоўным корпусам БДУ цяпер можна назваць прыгожы чырвоны будынак, які знаходзіцца на тэрыторыі універсітэцкага гарадка. Да рэстаўрацыі гэта быў фізічны корпус. Цяпер тут размяшчаецца рэктар, ягоныя памочнікі, амаль усе прарэктары, вучэбна-метадычны аддзел, упраўленне па міжнародных сувязях. Хутка пераедзе ў гэты будынак аддзел кадраў. Акрамя таго, ёсць некалькі залаў — Габеленавая і Зала паседжанняў Вучонага Савета. Працуе кавярня, дзе можна даволі танна і разнастайна падсілкавацца.

НАШ ДВОР

НЕЗАЛЕЖНА АД НАДВОР'Я

Напэўна, кожны, хто трапляе ва універсітэцкі дворык БДУ, звяртае ўвагу на амаль штодзённыя перамены ў ягоным знешнім убранні. Здаецца, дворык яшчэ ніколі не быў такім чыстым, дагледжаным. Асабліва вылучаецца квітнеючая горка, якая з'явілася некалькі месяцаў таму насупраць галоўнага корпуса.

Калі я паспрабавала высветліць больш падрабязна пра гэта ў Сяргея Архіпавіча Сідарава, дырэктара дырэкцыі па будаўніцтву аб'ектаў універсітэта, той адразу ж паведаміў, што гэтай справай непасрэдна займалася інжынер Ніна Геральдаўна Разуваева. Адшукаць жа Ніну Геральдаўну было няцяжка — ва універсітэце яна працуе ўжо даўно. Заўсёды ветлівая, сціплая. Яе калегі, даведаўшыся пра мэту майго візіту, адразу папярэдзілі, што яна, магчыма, і не прызнаецца, як летам даглядала кветкі нават падчас свайго адпачынку.

Пры сустрэчы Ніна Геральдаўна расказала, што задума ўпрыгожыць тэрыторыю насупраць галоўнага корпуса ўзнікла даўно. Раней яе проста засейвалі травой, але абавязкова праз нейкі час тут з'яўлялася некалькі вытаптаных сцежак — студэнты і супрацоўнікі, ідучы ў галоўны корпус, скарачалі шлях. Было некалькі праектаў. Адзін з іх распрацавалі супрацоўнікі Цэнтральнага батанічнага сада. Разам з намеснікам дырэктара Іванам Казіміравічам Валадзько, спецыялістамі па кветках падбіралі расліны. Неабходна было зрабіць траўнік, які быў бы прыгожым ад вясны да позняй восені, — нешта накшталт Альпійскай горкі, калі адны кветкі адцвітаюць, адразу ж распускаюцца іншыя. Магчыма, прызналася Ніна Геральдаўна, атрымалася не ўсё так, як задумалі: не хапае разнастайнасці колераў, і горка высакаватая. Але гэта справа не аднаго сезона.

Першыя кветкі для запланаванай горкі набылі ў Батанічным садзе яшчэ ў сярэдзіне мая. Так, паціху, засадзілі ўсю клумбу. Даглядаў яе Уладзіслаў Іванавіч Валадзько, садоўнік Батанічнага сада. Спачатку сапраўды было цяжка паверыць, што калі-небудзь усё зацвіце. Увогуле, лета выдалася дажджлівым. Але на яго пачатку было вельмі спякотна — і пасаджаныя кветкі давялося кожны дзень паліваць, інакш яны проста не прыняліся б. Ніна Геральдаўна прыходзіла на працу вельмі рана — расліны трэба было паліваць да сонца. Многія нават жартавалі на гэты конт, прызналася яна, цікавіліся, ці не перамяніла прафесію. Але Ніна Геральдаўна заўсёды адказвала, што проста ратуе кветкі — так удалося выратаваць усе. Цяпер тэрыторыю універсітэцкага гарадка ўжо некалькі тыдняў даглядае Ніна Матвееўна Скрыпчанка, інжынер садова-паркавых гаспадарак.

Хочацца верыць, што калі ў БДУ будуць працаваць такія клапатлівыя людзі, універсітэцкая горка квітнець будзе заўсёды, незалежна ад надвор'я.

Таццяна КУХАРЧУК

ДЗЕНЬ, ЯКІ ЧАКАЛІ ГОД

Гэты дзень студэнты і выкладчыкі факультэта міжнародных адносін чакалі амаль год. І вось ён наступіў. 23 верасня расчыніла дзверы новая бібліятэка факультэта — сёмая сярод факультэцкіх бібліятэк, што ўваходзяць у склад фундаментальнай бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта. Калі ж узяць пад увагу тое, што працуюць яшчэ і асобныя чытальныя залы, то яна апынецца наогул трынаццатай. Але гэты нешчаслівы лік не сапсаваў агульны прыўзняты аптымістычны настрой. Кожны, хто прыйшоў на ўрачыстую цырымонію прэзентацыі, быў упэўнены, што ў "нованароджанай" бібліятэкі — вялікая будучыня.

Перад гасцямі ў шэраг выстраіліся 14 супрацоўніц і адзін супрацоўнік універсітэцкай бібліятэкі, якія адказваюць за вядучыя кірункі яе дзейнасці. Яны ў вершаванай форме прывіталі з'яўленне на свет новай бібліятэкі, далі абяцанне старанна выконваць свае службовыя абавязкі. Яны былі і галоўнымі арганізатарамі, і героямі свята, бо толькі сумесная праца спецыялістаў-бібліёграфаў усіх адзелаў дазволіла спраўдзіцца даўнім марам. Пра гэта казала дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Ірына Уладзіміраўна Арахоўская. З асаблівай удзячнасцю яна адазвалася аб самаадданай працы на працягу года загадчыцы новай бібліятэкі Валянціны Іванаўны Захаравай. Ёй належала большасць віншаванняў, ёй быў перададзены вялікі сімвалічны ключ ад новага месца працы. Прывітанні пачулі і маладыя супрацоўніцы, якія толькі што скончылі Беларускі універсітэт культуры.

Але не толькі ад намаганняў бібліятэкараў залежала, ці атрымае факультэт доўгачаканую бібліятэку. Трэба было стварыць спрыяльныя ўмовы для заняткаў, для захавання фонду. Гэтая задача вырашана на 100 працэнтаў, дзякуючы агульным намаганням — ад рэктара БДУ да студэнтаў-першакурснікаў. Гэта выказаў у сваёй прамове дэкан факультэта міжнародных адносін Аляксандр Віктаравіч Шарапа. Ён звярнуў увагу прысутных на вельмі прывабнае аздабленне бібліятэкі, выкананае ў еўрастылі, на яе аснашчанасць першакласнай мэбляй і абсталяваннем. Шчырую падзяку дэкана заслужылі выкладчыкі, што ахвяруюць унікальную літаратуру, прывезеную з замежных паездак, пасольствы, акрэдытаваныя ў Мінску (яны падарылі факультэту значную колькасць кніг, якія нельга знайсці больш нідзе ў краіне), Цэнтр па вывучэнні ААН.

Аляксандр Віктаравіч выказаў і некаторыя пажаданні. Яшчэ чакае свайго ўпарадкавання спецыяльны фонд па праблемах міжнародных адносін, неабходны для падрыхтоўкі добрых спецыялістаў-міжнароднікаў: зараз большасць літаратуры раскідана па кнігасховішчах некалькіх факультэтаў. Адчуваецца пакуль і недахоп літаратуры па тых замежных мовах, вывучэнне якіх у ВНУ Беларусі раней амаль не вялося: арабскай, кітайскай, японскай, іўрыце, шведскай.

У перспектыве — адкрыццё абанемента навучальнай літаратуры, камп'ютэрызацыя і далейшае камплектаванне кніжнага фонду. Як адзначыў загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы Леанід Вікенцьевіч Лойка, з цягам часу бібліятэка павінна стаць галоўным інфармацыйным цэнтрам у галіне міжнародных адносін не толькі ў БДУ, але і ў краіне.

Леанід ФЯДОТАЎ, студэнт факультэта міжнародных адносін

ВІНШУЕМ!

Срэбны дождж над ліцэем

Скончылася лета... Для большасці з тых, хто вучыцца, яно было парой адпачынку ад падручнікаў і заняткаў. Але гэта не датычылася невялікай групы беларускіх школьнікаў — пераможцаў Рэспубліканскіх алімпіяд па фізіцы, хіміі, матэматыцы і біялогіі, якім давялося прыняць удзел у Міжнародных алімпіядах. У гэтым годзе фізікі сабраліся ў Рэйк'явіку, матэматыкі — на Тайвані, біёлагаў сустракала Германія, горад Кіль, а далей за ўсіх давялося падарожнічаць хімікам — аж у Мельбурн, што ў Аўстраліі.

З дзевятнаццаці прадстаўнікоў Беларусі на інтэлектуальных спаборніцтвах такога высокага рангу было дзевяць навучэнцаў ліцэя БДУ. Трэба заўважыць, што нават проста ўдзел у Міжнароднай алімпіядзе, якая збірае інтэлектуальную эліту ўсяго свету, з'яўляецца вялікім поспехам для любога юнака і дзяўчыны, а атрыманне ўзнагароды — сапраўдны трыумф. «Трыумфатарамі» сталі трынаццаць школьнікаў Беларусі, і сярод іх — аж сем прадстаўнікоў нашага ліцэя. Срэбраныя медалі атрымалі: Іван Лосеў (матэматыка), Яўген Пляшэвіч і Святлана Мартыненка (хімія), Аляксей Бязручка і Юрый Любецкі (біялогія). Бронзу прывезлі Іван Сіўцоў (фізіка) і Дзмітрый Бадзягін (матэматыка).

Вельмі прыемна, што ўсе пераможцы, якія сёлета скончылі ліцэй, сталі студэнтамі адпаведных факультэтаў БДУ, а дзесяцікласнікі Іван Лосеў, Яўген Пляшэвіч і Дзмітрый Бадзягін маюць магчымасць яшчэ раз удзельнічаць у Міжнародных алімпіядах будучага года і нават прывезці золата...

Т. А. КАЛЕВІЧ, выкладчык ліцэя БДУ

СЛУЖБА 02

БАРАНІЦЕСЯ АД ЗЛОДЗЕЯЎ

У Мінску штодзённа рэгіструюцца крадзяжы з кватэраў. За апошні час, на жаль, колькасць іх узрасла. За восем месяцаў бягучага года ў Маскоўскім РУУС Мінска зарэгістравана 320 кватэрных крадзяжоў пры 285 за аналагічны перыяд мінулага года.

Большая частка гэтых злачынстваў — вынік зручнага выпадку. Па няведанню альбо па халатнасці пацярпелыя самі даюць злачынцу такую магчымасць.

У адну з кватэр дома па праспекце "Праўды", дзе пражывае студэнт II курса БДУ, 23 студзеня ў 12 гадзін пазванілі ў дзверы. Нічога не падазраючы, гаспадар адчыніў. Пяцёра невядомых уварваліся ў кватэру і пад пагрозай фізічнай расправы забралі радыё- і відэаапаратуру.

Злачынствам нярэдка спрыяюць самі грамадзяне, якія не забяспечваюць захаванасць сваей маёмасці: у цёплую пару года пакідаюць адкрытымі форткі і дзверы на балкон. Вельмі часта някліканых гасцей у кватэры пускаюць дзеці, якім яны прадстаўляюцца знаёмымі бацькоў ці калегамі па працы, настаўнікамі. Аматары лёгкай нажывы карыстаюцца і тым, што дзверы і замкі нярэдка слаба ўмацаваныя. Аналіз злачынстваў паказвае, што значная колькасць кватэрных крадзяжоў адбываецца праз узламанне ўваходных дзвярэй.

У лютым бягучага года такім чынам быў здзеснены крадзёж залатых вырабаў і магнітафона з кватэры студэнткі I курса БДУ. У ліпені адбыўся крадзёж залатых вырабаў і вялікай сумы грошай з кватэры на праспекце газеты "Известия", дзе пражывае лабарант БДУ. 6 верасня, узламаўшы ўваходныя дзверы ў кватэры дома па вул. Касманаўтаў, дзе пражывае студэнтка II курса БДУ, невядомы выкраў залатыя вырабы.

Каб пазбегнуць кватэрных крадзяжоў, Маскоўскі РУУС Мінска раіць вам:

- не пакідаць ключы ў вызначаных месцах, а таксама ў месцах, лёгкадаступных для пабочных асоб;
- абсталяваць уваходныя дзверы вочкамі, мэтазгодна ўстанавіць двайныя дзверы, паставіць дадатковы замок;
- сыходзячы з дома, не пакідаць уваходныя і балконныя дзверы, форткі адкрытымі. Лоджыі і балконы першых і апошніх паверхаў варта зашкліць або паставіць на іх краты;
- мэтазгодна заключыць дамову з аддзяленнем аховы на абсталяванне вашай кватэры сродкамі сігналізацыі.

У выпадку, калі вы заўважыце асоб, якія выносяць рэчы з дома, і іх паводзіны выклічуць у вас падазрэнне, паведаміце ў міліцыю па тэлефонах 02, 256-07-52, 256-78-15.

Нэла ШПАК, супрацоўнік Маскоўскага РУУС г. Мінска

Студэнцкая пара — гэта не толькі навучанне і іспыты. Гэта яшчэ і адпачынак на канікулах. Адпачынак, які арганізоўвае прафкам студэнтаў БДУ.
Тыя, хто паспяхова здае зімовую сесію, могуць паехаць на канікулы ў дом адпачынку «Нарач».
Але найлепшая пара для студэнтаў, зразумела, лета. Летам вы можаце паехаць у лагер працы і адпачынку на ўзбярэжжа Крыма. А калі вы маеце намер паправіць здароўе, прафкам студэнтаў прадаставіць вам пуцёўку ў лепшыя санаторыі не толькі Беларусі, але і Украіны, Прыбалтыкі, Малдовы. У тым выпадку, калі вы схіляецеся да сумяшчэння адпачынку і навучання, вам папросту не абысціся без пуцёўкі ў санаторый-прафілакторый БДУ.

ПОСТФАКТУМ

У «КАКТЭБЕЛЬ» ПА ВОПЫТ

У канцы жніўня гэтага года на базе дзіцячага аздараўленчага лагера «Кактэбель», размешчанага ў пасёлку Курортны Феадасійскага раёна, адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы арганізацыі выхаваўчага працэсу ў летнім аздараўленчым лагеры».

У рабоце гэтай канферэнцыі бралі ўдзел прадстаўнікі Украіны, Беларусі і Расіі. Сярод удзельнікаў — галоўны спецыяліст па рабоце з дзецьмі Савета Федэрацыі прафсаюзаў Крыма Н.С. Краснова, намеснік мэра горада Феадосіі, начальнік аддзела статыстыкі гарвыканкома П. С. Бяндзікас, начальнік аддзела міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь А.М. Самусенка, вучоныя з Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Варонежскага дзяржаўнага універсітэта педагогікі, практычныя работнікі дзіцячых аздараўленчых лагераў Крыма, студэнты хімічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў БДУ, якія ў гэтым годзе праходзілі педагагічную практыку ў «Кактэбелі».

Было заслухана і абмеркавана больш за 20 дакладаў: выкладчыкі, арганізатары дзіцячага вольнага часу, кіраўнікі маладзёжных арганізацый, студэнты дзяліліся вопытам сумеснай работы універсітэтаў з аздараўленчым лагерам «Кактэбель». Дарэчы, студэнты хімфака БДУ ўжо шосты год набіраюцца педагагічнага вопыту менавіта ў гэтым лагеры.

Выступоўцы звярнулі ўвагу на тое, што практычна адсутнічае дзяржаўная фінансавая і арганізацыйная падтрымка — кіраўнікі лагераў павінны шукаць спонсараў альбо зарабляць грошы самастойна, а гэта, безумоўна, негатыўна адбіваецца на арганізацыі выхаваўчага працэсу. Да таго ж, падрыхтоўка студэнтаў ВНУ да выхаваўчай працы ў лагеры паранейшаму застаецца нявырашанай праблемай педагогікі вышэйшай школы. На некаторых факультэтах нават скасавана абавязковая летняя практыка. Правядзенне спецсемінараў па пытаннях методыкі выхаваўчай работы ў лагеры залежыць пакуль ад ініцыятывы саміх выкладчыкаў.

Па выніках работы канферэнцыі выйшаў у свет зборнік матэрыялаў, якія з'яўляюцца вынікам тэарэтычных і эксперыментальных даследаванняў вопыта работы па арганізацыі выхаваўчага працэсу ў летнім аздараўленчым лагеры. Фінансавую падтрымку ў выданні матэрыялаў канферэнцыі аказаў прафсаюзны камітэт студэнтаў БДУ.

Акрамя таго, удзельнікі канферэнцыі распрацавалі некаторыя рэкамендацыі для арганізатараў дзіцячага адпачынку. Падкрэслена, што выхаваўчы працэс у лагеры павінен абапірацца на такія палажэнні, як бяспека жыцця і здароўя дзяцей, абарона іх правоў і асабістага гонару; прыярытэт індывідуальных інтарэсаў і інш. Дзіцячы адпачынак неабходна арганізаваць з выкарыстаннем розных тыпаў лагераў: загарадныя дзіцячыя аздараўленчыя лагеры (спартыўныя, юных натуралістаў, эколагаў, тэхнікаў, турыстаў, аматараў мастацтва і інш.); лагеры працы і адпачынку для старшакласнікаў; лагеры для падлеткаў і старшакласнікаў (конна-спартыўныя, турыстычныя, абмен групамі паміж рознымі лагерамі). Неабходна ствараць умовы для разумовага і інтэлектуальнага развіцця дзяцей, усебакова выхоўваць іх — любіць прыроду, свой народ, ведаць культуру і гісторыі роднага краю. Акрамя таго, у сучасных умовах арганізацыя выхаваўчага працэсу ў лагеры немагчыма без псіхолага-педагагічнага і юрыдычнага забеспячэння.

Дарэчы, канферэнцыя будзе праходзіць штогод, і яе удзельнікі спадзяюцца, што гэта дапаможа арганізаваць адпачынак нашых дзяцей на больш высокім узроўні.

Павел БЫЧКОЎСКІ,
сацыяльны педагог
хімічнага факультэта

Спякотнае сонца над вінаградніkам

Таму, хто вырашыў паехаць у летні працоўны атрад у Карэіз, яшчэ да прыбыцця на месца трэба прайсці праз пэўныя выпрабаванні: некалькі месяцаў чакання паездкі, падача заяў, мноства арганізацыйных збораў, здача грошай на білеты, медагляд, набыццё прадуктаў, чаканне выезда, мітусня на вакзале, штурханіна ў вагоне, блытаніна з рэчамі, нервовае развітанне з бацькамі, душны вагон, імправізаваны стол, бяссоныя 33 гадзіны шляху, пагранічны кантроль, спякотны Сімферопаль. Потым ізноў блытаніна на вакзале, набыццё білетаў на тралейбус у гадзіну-пік, 2 гадзіны ў душным тралейбусе, пагрузка на грузавік у Ялце, яшчэ 45 хвілін у кузаве да Карэіза, рассяленне па пакоях у інтэрнаце. Гэта далёка не поўны спіс таго, што вас чакае на шляху ў Крым. Далей наступае другая (асноўная) частка паездкі — суровыя будні студэнта ў Крыме.

Але ў вольны час вы можаце рабіць усё, што пажадаеце — мора, пляжы, сонца, мноства забаў і экскурсій. Толькі гадзіну ісці пешшу ад лагера да Варанцоўскага палаца. Чатыры гадзіны ўзыходжання альбо 20 хвілін на канатцы — і вы на вяршыні Ай-Петры. Паўгадзіны на маршрутцы — вы ў цэнтры Ялты.

Вечар і ноч можна правесці ў лагеры, наладзіць вечарыну і дыскатэку. Калі ж вас гэта не задавальняе, можна пайсці ў бар, рэстаран, на дыскатэку, якія працуюць да самай раніцы. Для рамантычных асоб, магчыма, будзе прыемна пакупацца ў моры пры святле месяца альбо проста паляжаць на пляжы, разглядаючы незлічоную колькасць зорак да самага світанку. Згадзіцеся, што саракахвілінnае ўзыходжанне ад мора ў лагер — не вялікая плата за начное задавальненне. А раніцою ізноў пад'ём у сем гадзін, праца і спякотнае сонца над вінаградніkам.

Але нягледзячы на ўсе цяжкасці ад гэтых 25 дзён застаюцца ў памяці толькі прыемныя ўражанні. Акрамя таго, набываеш мноства новых сяброў. І заўсёды марыш вярнуцца сюды ізноў.

Аляксандр ХАХЛОЎ

Я ЕДУ Ў БУДАТРАД

Я зноў еду. Уначы ўсё часцей сню двух'ярусныя ложкі і родны барак. Падскокваю ў халодным поце і ліхаманкава шукаю заплечнік. Прадуктамі пачынаю запасацца загадзя. Ем за трох, а па святах — за чатырох, дзеля чаго сям'я пачынае вымушаную галадоўку. На тых, хто не едзе (а іх большасць), гляджу з невытлумачальнай шкадобай і пяшчотай. Хочацца зрабіць для іх што-небудзь прыемнае. Спіс неабходных рэчаў, складзены пры першай магчымасці і страчаны літаральна на наступны дзень, займае аб'ём, роўны перапісцы невялікай установы за год. І для перавозкі рэчаў патрабуецца самалёт. Пасля скарачэння спіс павялічваецца на 38 %, а самалётаў патрабуецца ўжо два. Зрэшты, наважваешся ехаць на поўдзень у чым маці нарадзіла (гэта значыць — у майцы, шортах, кедах, кепцы і з 30-кілаграмовым заплечнікам).

Распланоўваючы 20 дзён, збіраешся схадзіць на 24 экскурсіі, арганізаваць 14 святаў і паўдзельнічаць у 4 дэбошах. Ну вось, нарэшце, ты гатовы, заплечнік сабраны, і ты ідзеш на вакзал, усяго на два дні раней за тэрмін. Але што такое два дні ў параўнанні з 11 месяцамі чакання. Я еду на поўдзень. Ура!

Студэнты 3-й змены атрада «Масандра»

СВІТАНАК У ГАРАХ

Я часта прыгадваю летнія дні ў Крыме, праведзеныя ўдалечыні ад тутэйшай мітусні. Усе праблемы застаюцца тут, а там — толькі мора, сонца, горы. Там чакаюць цябе новыя сустрэчы, новыя сябры, новыя ўражанні.

Хаця спярша ўмовы не здаюцца такімі прывабнымі. Падымацца даводзіцца а палове шостай раніцы, паспаўшы да таго пару гадзін, збірацца — за 5 хвілін. Але як гэта цудоўна — сустракаць світанак на вінаградніках у гарах...

Незабыўнае ўражанне пакідае і адна электраплітa на 26 чалавек. З-за гэтага гарбаты даводзіцца чакаць гадзіну-паўтары. Але за гэты час смак гарбаты нейкім загадкавым чынам набывае асаблівы водар, і яе п'еш з вялікай асалодай.

А якія на моры ночы! Можна бясконца доўга ляжаць на пляжы, слухаючы шум мора...

Я думаю, што вы не пашкадуеце, калі надумаеце паехаць у будатрад, і вам назаўжды запомняцца тыя дні.

Аксана КАВАЛЁВА, камандзір будаўнічага атрада «Красный рай»

ВЫДАТНЫЯ ВАЖАТЫЯ

У ліпені і жніўні на базе дзіцячага аздараўленчага лагеря «Кактэбель» праходзілі педагагічную практыку студэнты хімічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. Работа важатага складаная і адказная. Гэта і агромная адказнасць за дзяцей, якія адпачываюць у лагеры, і высокая патрабавальнасць з боку кіраўніцтва.

Адпачывалі ў лагеры дзеці з розных рэгіёнаў Украіны і Расіі. Кожны са сваімі звычкамі і прыхільнасцямі. Задача важатых — аб'яднаць іх і зрабіць знаходжанне ў лагеры цікавым, карысным і запамінальным. Калі дадаць да таго складаныя кліматычныя ўмовы (тэмпература паветра часам дасягала 45 градусаў спякоты), асаблівасці прыроднага ландшафта (высокія горы і глыбокае мора), то вы зразумееце, як складана было нашым беларускім важатым. Але яны справіліся, змаглі рэалізаваць свой патэнцыял, атрыманыя ва універсітэце веды і навыкі.

Трэба было бачыць, з якой нецярплівасцю на летняй эстрадзе лагера ўсе дзеці чакалі выступлення 16 атрада — гэта быў атрад важатых Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Падчас падвядзення вынікаў аднадушна ўсім важатым была выстаўлена адзнака «выдатна». А лепшыя з лепшых прынялі ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы арганізацыі дзяцей у дзіцячым аздараўленчым лагеры».

Руслан ПАПОК, кіраўнік педагагічнага атрада

ГЭТА ЗДОРАВА

Увогуле, наведаць Крым — гэта здорава! Дарэчы, у гэтым годзе за ўсю нашу змену было вельмі мала пахмурных дзён, а мора, асабліва ў першыя паўтара тыдні, было проста як сырадой. Некаторыя з нас нават скардзіліся: «Ніякага асвяжальнага эфекту!»

А сустрэча світанку? А купанне па месяцовай дарожцы? Вы пакаралі калі-небудзь вяршыні гор і бачылі, як выглядае з вышыні мора? Вы елі хоць раз персікі памерам у два кулакі? Аб'ядаліся міндалём, вінаградам і кавунамі? У вас быў калі-небудзь добры настрой на працягу ўсяго месяца? Катэгарычна не рэкамендую ехаць у такі студэнцкі атрад людзям, якія любяць нудоту, аднастайнасць, не ходзяць у падарожжы, ненавідзяць жыццё і ўсіх навокал.

Паездка ў Крым неяк пераўтварае людзей. Гэта магчымасць папоўніць свой багаж новымі ўражаннямі, адчуваннямі, густамі і пахамі, паказаць сябе, займець новых сяброў, а некаторым пашчасціла знайсці і сваю палову. Таму вялікі дзякуй прафкаму БДУ.

Аляксей КАЗНАДЗЕЙ, камандзір ЛПА «Кактэбель»

БЕЛАРУСКІ МАГНАТ З ФРАНЦЫІ

У гэтым годзе геаграфічная навука адзначае слаўную дату — 225 гадоў з дня нараджэння аднаго з заснавальнікаў беларускай геаграфічнай літаратуры, падарожніка і прыродазнаўцы, мецэната і палітычнага дзеяча Аляксандра Сапегі.

Па іроніі лёсу Аляксандр Сапега нарадзіўся ў Францыі 3 верасня 1773 года, у сям'і палкоўніка Юзэфа Сапегі са старажытнага магнацкага роду, прадстаўнікі якога ў XV — XVIII стагоддзях займалі высокія дзяржаўныя і ваенныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім. Ранняе дзяцінства Аляксандр правёў у Страсбургу, куды бацькі пераехалі адразу ж пасля паражэння Барскай канфедэрацыі (узброенага саюза беларускай шляхты супраць польскага караля Станіслава Панятоўскага і царскай Расіі) і І падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе. У пачатку 1777 года Сапегі вярнуліся на радзіму. Аляксандр жыў у маёнтках Сямяцічы і Коцк пад Брэстам у цёткі Ганны Яблонскай з роду Сапегаў, пад уплывам якой з дзяцінства праявіў цікавасць да прыродазнаўства. Аляксандр карыстаўся яе вялікай бібліятэкай і мінералагічным музеем. Хлопец атрымаў выдатную хатнюю адукацыю, яго настаўнікамі былі вопытныя педагогі Я. Свядэрскі і Р. Ладоўскі, а пазней француз Н. Ватрэн, які быў да гэтага хатнім настаўнікам у сям'і Браніцкіх. Маці, Тэафілія Сапега-Яблонская, выхаваннем сына амаль не займалася. Вялікае значэнне для фармавання Сапегі як прыродазнаўцы мела знаёмства з Жанам Жыліберам, прафесарам гісторыі прыродазнаўства Галоўнай школы ў Вільні і заснавальнікам першай у Беларусі медыцынскай акадэміі ў Гродна, з якім ён усё жыццё падтрымліваў сяброўства і навуковыя сувязі.

У 1792 годзе Сапега пазнаёміўся са Станіславам Сташыцам, заснавальнікам Горнай школы ў Кельцы, на базе якой пазней узнікла славутая Кракаўская Горная акадэмія. Абодва цікавіліся геалогіяй усходніх раёнаў Польшчы. Праз два гады яны накіроўваюцца ў Вену для ўдасканалення ведаў у галіне геалагічных навук, наведваюць Альпы, Апенінскі паўвостраў, Францыю. У 1797-1802 гадах Сапега самастойна даследуе геалогію Усходняй Польшчы, Валыні і Літвы, галоўным чынам яго цікавіць мінералогія крышталічных парод. У выніку гэтых даследаванняў выдаў дзве кнігі па мінералогіі. У 1800 годзе па рэкамендацыі Сташыца Сапега робіцца членам таварыства «Сяброў навукі» у Варшаве і займаецца стандартызацыяй мер і вагі ў Польшчы, Беларусі і Літве па прыкладу метрычнай сістэмы Заходняй Еўропы. Друкуе на польскай і французскай мовах сваю працу «Параўнаўчая табліца новых французскіх і літоўскіх (польскіх) мер і вагі». Друкуе ў польскіх часопісах («Pamiętnik warszawski» і інш.) шэраг артыкулаў па геалогіі, геаграфіі і этнаграфіі, выдае на польскай мове падручнік па неарганічнай хіміі.

У пачатку XIX стагоддзя Сапега ажыццяўляе працяглае падарожжа па Балканах уздоўж Адрыятычнага мора: лісты жонцы ён адрасаваў з Далмацыі, Грэцыі і Турцыі. Падчас падарожжа наведаў Далмацыю (Харватыю), Боснію, Герцагавіну, Чарнагорыю і Албанію, якія знаходзіліся тады пад аўстралійскім і турэцкім уладараннем, што было для яго небяспечна. У 1804 годзе на шляху з Італіі ў Францыю праз перавал Мон-Сені цікаўны натураліст падняўся на найвышэйшыя вяршыні Альпаў і паведаміў аб гэтым узыходжанні ў ліпені таго ж года на пасяджэнні Ліёнскай Акадэміі навук, літаратуры і мастацтва пад старшынствам свайго сябра Ж. Жылібера (рукапіс даклада захоўваецца ў архіве акадэміі). На Балканах Сапега наведаў практычна ўсе унікальныя аб'екты прыроды, выявіўшы цікавасць да рымскіх і славянскіх старжытнасцяў, да эканомікі і прамысловасці на фабрыках і рудніках. У Істрыі падарожнік наведаў адзіныя на той час у Еўропе ртутныя руднікі. З рызыкай для жыцця ён спускаўся ў падземныя вырабаткі. Вывучыў мармуровыя каменяломні, дзе венецыянцы здабывалі мармур для аблiцоўкі сваіх знакамітых каналаў. Даследаваў руіны Скардоны — старажытнай сталіцы рымскай правінцыі Лібурніі. Вывучаў геалогію акваторыі Адрыятыкі, пераплываючы неаднаразова ў Італію і Грэцыю. Уражанні пра сваё падарожжа Сапега надрукаваў у выглядзе лістоў да Жылібера ў Ліён. Гэтая кніга з'яўляецца сапраўдным помнікам геаграфічнай літаратуры пачатку XIX стагоддзя.

Вярнуўся Сапега на радзіму ў 1806 годзе з вялікімі калекцыямі праз Парыж, дзе стаў прыхільнікам Напалеона. У маі таго ж года паведаміў таварыству «Сяброў навукі» аб завяршэнні свайго падарожжа, а ў снежні зрабіў у Варшаве даклад. У студзені 1807 года ўдзельнічаў у арганізацыі пераезда Напалеона ў Варшаву, падрыхтаваў шматлікія матэрыялы аб стане краіны (па пытаннях палітыкі, культуры, эканомікі) і хутка стаў набліжаным да акружэння імператара — быў уключаны ў ганаровую гвардыю Напалеона, узнагароджаны ордэнам Ганаровага легіёна і найвышэйшым ордэнам Францыі «Залаты арол Ганаровага легіёна». Падчас знаходжання Напалеона ў Варшаве прачытаў даклад пра Балканы «Ад Афін да Ліёна», які ў галіне рэгіянальнай геалогіі стаў наватарскім.

28 верасня 1808 года Сапега ўдзельнічае ў Вялікай свіце Напалеона пры сустрэчы з рускім імператарам Александрам I у Эрфурце. Тут Сапега быў абраны ганаровым членам Акадэміі навук, быў таксама абраны членам навуковых таварыстваў у Турыне і Ліёне.

У 1809-1811 гадах Сапега праводзіць геалагічныя даследаванні ў Польшчы, вандруе па Галіцыі, рыхтуе да выдання свае дзённікі «Падарожжа па славянскім краі». Першая частка кнігі з апісаннем шляху ад Трыеста да Дуброўніка была выдадзена ва Уроцлаве ў 1811 годзе і перавыдадзена ў 1856 годзе. Другая частка кнігі была выдадзена толькі ў 1983 годзе Т. Яблоньскім. Кніга падрабязна асвятляе пытанні геалогіі і геаграфіі, археалогіі і этнаграфіі, апісвае помнікі культуры. Сам факт надрукавання сваіх дзённікаў ён патлумачыў такім чынам: «Для падарожніка злачынна не заўважаць звычаі народа і не апісваць іх».

Сапега ідэалізуе славян, уся кніга прасякнута духам сапраўднага славянафіла. У сувязі з гэтым цікавы наступны факт. Падчас падарожжа Сапегі па Балканах за ім сачылі аўстрыйскія агенты. Яны меркавалі, што гэта «вандроўка» ажыццяўляецца па палітычных меркаван-

ПАДАРОЖЖА АЛЯКСАНДРА САПЕГІ (1802 – 1804 гг.)



нях, і імкнуліся высветліць, на каго «працуе» беларускі магнат — на Расію ці Францыю. Французская паліцыя падазравала Сапегу ў сакрэтнай службе на карысць Расіі, а Тайлеран у перапісцы з Напалеонам абвінавачваў Сапегу ў непрыязі да французаў. Польскія даследчыкі на гэты конт адназначнага адказу не даюць. Разам з тым, кнігі і навуковыя артыкулы Сапегі сведчаць аб яго патрыятызме і добрым стаўленні да ўсіх славян. Ён падкрэсліваў блізкасць славянскіх народаў па мове і звычаях, а паўднёвых славян называў самым прыгожым, высокародным і ахайным народам Еўропы, адзначаў іх дружалюбнасць да Расіі — адзінай на той час славянскай дзяржавы.

Увосень 1812 года ў сутыкненні з дзікім вепруком на паляванні ў Белавежскай пушчы Аляксандр Сапега атрымаў сур'ёзную траўму. Развілася гангрэна, і 8 верасня ён памёр у Дзярэчыне пад Зэльвай — маёнтку Францішка Сапегі, генерала літоўскай артылерыі, і там быў пахаваны. Праз 9 гадоў, 25 верасня 1821 года, яго цела было эксгумiравана і перавезена ў Вішніцы для захавання ў сямейным склепе. Пасля смерці А. Сапегі застаўся невыдадзеным рукапіс «Аб звычаях і літаратуры славянскай»...

В. А. ЯРМОЛЕНКА,
доктар
геаграфічным навук

З ГІСТОРЫЯЙ НА "ТЫ"

Гэты дзень у жыцці універсітэта

Кастрычнік

40 гадоў назад на базе фізіка-матэматычнага факультэта былі створаны фізічны і матэматычны.

8.10. — 60 гадоў з дня нараджэння Івана Іванавіча Сачанкі, беларускага публіцыста, педагога, грамадскага дзеяча. Доктар гістарычных навук, прафесар. З 1970 года працаваў на на кафедры гісторыі журналістыкі БДУ. З 1984 года ўзначальваў кафедру замежнай журналістыкі і літаратуры. Старшыня мінскага гарадскога аб'яднання малалетніх вязняў фашызму.

10.10. — 75 гадоў з дня нараджэння Усевалада Міхайлавіча Сікорскага, беларускага гісторыка. Член-карэспандэнт АН Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навук Беларусі. Скончыў БДУ. Удзельнік партызанскага руху на Беларусі. З 1953 года працуе ў БДУ. З 1972 па 1978 года — рэктар Белдзяржуніверсітэта. З 1978 года — загадчык кафедры. Займаўся праблемамі гісторыі КПСС, міжнароднага рабочага і камуністычнага руху.

11.10. — 55 год з дня аднаўлення дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі пад Масквою. Пачалі сваю працу гістарычны, філалагічны, біялагічны, геаграфічны, фізіка-матэматычны і хімічны факультэты. У БДУ на той час вучылася 300 студэнтаў.

13.11. — 70 год з дня пастановы ЦВК і СНК БССР «Аб рэарганізацыі Інстытута Беларускай культуры ў Беларускую Акадэмію навук». У ліку заснавальнікаў — вучоныя БДУ і першыя правадзейныя члены Я. М. Афанасьеў, М. Ф. Бліядуха, С. Я. Вальфсон, І. І. Замоцін, У. М. Ігнатоўскі, М. В. Грэдзінгер, Я. Ю. Лёсік, К. М. Міцкевіч (Якуб Колас), У. І Пічэта, А. М. Ясінскі.

14.12. — 100 год з дня нараджэння Івана Мікалаевіча Сяржаніна, беларускага заолага. Член-карэспадэнт АН Беларусі, кандыдат біялагічных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Скончыў БДУ. З 1933 года — у Інстытуце біялогіі АН Беларусі. Адначасова ў 1947-1970 гадах — прафесар кафедры заалогіі і пазваночных БДУ. Займаўся праблемамі фаўністыкі, зоагеаграфіі і экалогіі.

Рубрыку вядзе
А. ЗЕЛЬСКІ,
загадчык музея гісторыі БДУ

СТРАХ ВЫРАТОЎВАЕ ЧАЛАВЕЦТВА

Чаму мы баімся? Увогуле страх — зусім нармальная чалавечая эмоцыя, сігнал, які папярэджвае кожнага з нас аб узнікненні небяспекі, які прымушае засцерагацца. Калі б не было страхаў, чалавецтва даўно вымерла б. Болей за ўсё пакутуюць ад страхаў людзі з вялікім пачуццём адказнасці. Англійскія даследчыкі, дарэчы, лічаць, што інтэлектуальны ўзровень «баязліўцаў» нашмат вышэйшы, чым у спакойных людзей. Яны высвятлілі гэта з дапамогай тэстаў на інтэлект.

Хвароба ж — фобія — узнікае там, дзе страх носіць нелагічны характар. Напрыклад, баяцца агрэсіўнага натоўпу на дэманстрацыі, які можа вас растаптаць,— гэта нармальна, а баяцца натоўпу людзей на аўтобусным прыпынку — паталогія.

Стабільна ўсяго панічна баяцца 10 працэнтаў насельніцтва. Сярод жанчын працэнт вышэйшы, чым сярод мужчын. Цікава, што большасць баязліўцаў — яшчэ маладыя людзі (да 30 гадоў). Агарафобію — боязь адкрытай прасторы, людных месцаў, магазінаў — спецыялісты называюць «хваробай хатніх гаспадынь»: на 100 жанчын даводзіцца толькі адзін мужчына. Многія пачынаюць баяцца нават самых звыклых рэчаў. Цікава, што самы распаўсюджаны страх — страх метро — узнікае не ў прыезджых з іншых гарадоў, а ў мясцовых жыхароў, якія практычна штодзённа спускаюцца пад зямлю. Але ж парадокс: тыя, хто баіцца метро, у той жа час спакойна ездзяць на машыне з нявопытным вадзіцелем па дрэннай дарозе. І нікольі не хвалююцца.

Наконт узнікнення страхаў існуе каля 17 тэорый. Паводле адной з іх, страхі — гэта дзіцячыя псіхічныя траўмы, якія нагадваюць пра сябе на ўзроўні падсвядомасці. Але ў паловы пацыентаў страхі ўзнікаюць беспадстаўна. Адзначаліся выпадкі, калі даследчыкі за 300-400 гіпнатычных сеансаў на працягу 2-3 гадоў так і не знаходзілі псіхатраўмавальных момантаў. Напрыклад, дзеці, якія ніколі да таго не бачылі змей, не чыталі пра іх, панічна іх баяцца. Чаму — незразумела. Дзіцячыя страхі часта перарастаюць у дарослыя, але яны лічацца нормай і часта праходзяць самі сабой. Для звычайнага чалавека рызыка захварэць фабічным сіндромам раўняецца 10 працэнтам, для журналіста — 12 працэнтам, для псіхіятра — 14. Вось чаму людзі, схільныя да псіхічных захворванняў, нярэдка выбіраюць сваёй прафесіяй псіхіятрыю.

Тыя, хто пакутуе на фобіі, маюць патрэбу ў прафесійнай дапамозе. Страх перашкаджае ім нават працаваць: настаўнікі падчас прыступаў перапыняюць заняткі, кіраўнікі адмяняюць адказныя сустрэчы і нарады.

На сённяшні дзень самым дзейсным сродкам барацьбы са страхам з'яўляецца паступовае навучанне чалавека спакойным паводзінам у фобіягеннай сітуацыі. Такая тэрапія цягнецца на працягу некалькіх месяцаў. Хворы носіць з сабой таблічку з некалькімі «закляццямі» ад доктара. Некаторыя робяць сабе выратавальныя татуіроўкі на руках. Як ні дзіўна, гэта дапамагае.

І ўсё ж спецыялісты, на жаль, пакуль мала ведаюць аб паходжанні і заканамернасцях страхаў. Супакойвае хіба толькі адно адкрыццё: даследаванні псіхолагаў даказалі, што 95 працэнтаў таго, чаго мы баімся, наогул не здараецца!

На фота: Страхі ўзнікаюць у дзяцінстве

Ген, які прымушае нас баяцца

Вы сустракалі калі-небудзь чалавека, які б ні разу ў жыцці не зведаў пачуцця страху? У дзяцінстве многія з нас баяліся казачных пачвар і цемры. Але і дарослыя баяцца не менш, а можа, нават і больш за дзяцей. Таму што і праблем становіцца толькі больш. Яны баяцца страты працоўнага месца, хвароб дзяцей, экалагічных катастроф і крадзяжоў. Але вучоныя сведчаць, што большасць нашых страхаў не маюць пад сабой падставы.

Між тым, менавіта вучоныя адкрылі той самы ген, які прымушае нас баяцца. Амерыканскія біёлагі размясцілі мышэй ў кантэйнеры з металічнай падлогай і адначасова ўздзейнічалі на іх электрычным токам, яркім святлом і рэзкімі гукамі. Калі на наступны дзень мышы ізноў апынуліся ў тым самым кантэйнеры, яны літаральна застылі ў жаху.

Вучоныя параўналі таксама, як рэагуюць на гэты эксперымент мышы розных пародаў. Высвятлілася, што адны грызуны «навучыліся» баяцца, а другія — не. Параўноўваючы храмасомы гэтых жывёл, вучоныя знайшлі ў іх генах некаторыя адрозненні. Пакуль, праўда, невядома, ці адказваюць гэтыя гены за сам страх ці толькі за здольнасць запамінаць жах, які давялося перажыць. Але гэты эксперымент яшчэ раз запэўніў, што больш шанцаў застацца жывымі ў тых, хто страх запамінае і пазбягае тых месцаў, дзе аднойчы ўжо напужаліся.

Калі з цягам часу атрымаецца вылучыць ген страху, дык пазбаўляць хворых ад фобій будзе нашмат лягчэй.

Страх узнікнення страху

Навуцы вядома каля 300 фобій. Амерыканцы класіфіцыруюць страхі ў 57 раздзелаў. Асабліва даследаваным лічыцца эмбрыянальны страх. Першы гармон страху мы атрымліваем, яшчэ не нарадзіўшыся, калі маці падчас цяжарнасці была чымсьці моцна напалоханая. Існуе страх васьмі месяцаў — страх расстання з маці. Але самымі распаўсюджанымі лічацца фобіі, звязаныя са станам здароўя. У два разы вырастае колькасць хворых, якія пакутуюць ад страхаў у перыяды сацыяльных крызісаў: людзі баяцца галечы і пастаянна лічаць чамусьці, што іх кватэра абавязкова будзе абкрадзена.

Вось асноўныя віды страхаў

Танатафобія — боязь смерці.

Назафобія — страх захварэць: *канцэрафобія* — ракам, *сіфілафобія* — сіфілісам, *інфарктафобія* — інфарктам міякарду, *кардыяфобія* — парушэннем сардэчнай дзейнасці, *снідафобія* — СНІДам.

Эрэйтафобія — боязь пачырванець.

Аксіфобія — страх перад калючымі прадметамі.

Агарафобія — страх адкрытай прасторы.

Клаўстрафобія — боязь замкнутага прасторы.

Ксенафобія — боязь іншаземцаў і незнаёмых людзей.

Фобафобія — страх узнікнення страха.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Ум. друк. арк. 1

Падпісана ў друк у 12.00

1 КАСТРЫЧНІКА
Зак. 593.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 3, пакой 307, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Калюта В.Г., Крывадубская А.В.